Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07

DOI:10.17951/sb.2015.9.165
Studia Białorutenistyczne 9/2015 Literaturoznawstwo

Мікалай Хмяльніцкі

Białoruski Uniwersytet Państwowy (Mińsk, Białoruś)
Belarusian State University (Minsk, Belarus)

E-mail: khmelnickiNN@bsu.by

# Беларускія рэаліі ў нарысах-рэпартажах Мельхіёра Ваньковіча

*Realia białoruskie w szkicach z podróży Melchiora Wańkowicza*

*Belarusian realities in M. Wańkowicz's sketch-reportages*

Мельхіёр Ваньковіч (1892–1974) – вядомы польскі пісьменнік, публіцыст і журналіст ХХ ст., творчы талент якога прызнаны не толькі на радзіме, але і за мяжой. Яго называлі „каралём" і „бацькам польскага рэпартажа з-пад Менску", "найпершым гутарнікам сярод гутарнікаў". Пры жыцці гэты самабытны творца па розных прычынах не быў уганараваны ні адной прэстыжнай прэміяй ці дзяржаўнай узнагародай, і толькі ў дзевяностыя гады ХХ ст. яго імя надалі Вышэйшай школе журналістыкі ў Варшаве. Аднак літаратурнае і грамадскае прызнанне М. Ваньковіча, яго сувязі з Беларуссю не сталі падставай для таго, каб артыкулы пра гэтага творцу і грамадскага дзеяча з'явіліся ў ранейшых і ў сучасных даведачных выданнях Беларусі (выключэнне – невялікія публікацыі інфармацыйна-біяграфічнага характару, змешчаныя ў *Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва* (1985) і ў трэцім томе *Беларускай энцыклапедыі* [1996г.]). Падзеяй культурнага жыцця Беларусі стаў выхад грунтоўнай і багата ілюстраванай кнігі з серыі „Славутыя роды" на рускай мове пад назваю *Ваньковичи*, у якой сярод іншых матэрыялаў змешчаны невялікі публіцыстычны артыкул пра М. Ваньковіча і пераклад другой часткі аповесці *Шчанюковы гады*. Як слушна адзначыў Адам Мальдзіс: „На жаль, імя і прозвішча выдатнага польскага празаіка, нашага суайчынніка, Мельхіёра Ваньковіча мала што гаворыць сённяшняму беларускаму чытачу. Не перакладзены на нашу мову яго кнігі – нават тыя, якія напісаны на беларускім матэрыяле. Не ўвекавечана яго памяць ні ў Бярэзінскім раёне, дзе ён нарадзіўся, ні ў самім Мінску, дзе ён жыў. А між тым у даваеннай Польшчы і, асабліва, у Заходняй

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



Беларусі мала хто мог паспаборнічаць з ім па сваёй папулярнасці”[1].

Заідэалагізаванасць айчыннага ды і ўсходнеславянскага літаратуразнаўства, уключанасць творцаў ў складаныя палітычныя рэаліі XX ст. з’явіліся прычынай таго, што толькі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў мы паступова адкрываем для сябе многіх польскіх пісьменнікаў, якія па месцы нараджэння і па тэматыцы творчасці былі моцна звязаныя з Беларуссю. Маюцца на ўвазе, у прыватнасці, і Сяргей Пясецкі, і Ян Булгак, і Тадэвуш Канвіцкі, і Рышард Капусцінскі і многія іншыя. У гэтым шэрагу адметнае месца займае і Мельхіёр Ваньковіч, чые дзіцячыя гады і юнацкае сталенне звязаны з Міншчынай: нарадзіўся будучы пісьменнік у вёсцы Калюжыцы (зараз гэта Бярэзінскі раён), выхоўваўся ў беларуска-польскім шляхецка-сялянскім асяроддзі, у сям’і з багатымі патрыятычнымі і культурнымі традыцыямі (старажытны шляхецкі род герба „Ліс”, першае ўпамінанне пра які, у адпаведнасці з гістарычнымі крыніцамі, адносіцца да 1499 года; ды і імя прадзеда, мастака Валенція Ваньковіча чаго толькі каштуе!). Менавіта згаданыя вышэй фактары ў многім будуць вызначаць творчае ўяўленне М. Ваньковіча, якое сфарміравалася на перакрыжаванні моў, традыцый, культур, а таксама на стыку часоў – рамантычнага мінулага і драматычнай будучыні – і якое было сканцэнтравана на прыгажосці і рэаліях „краю дзіцячых гадоў”. „Малая радзіма” да канца зямнога шляху будзе для Мельхіёра Ваньковіча кропкай вышэйшага прыцягнення, крыніцай натхнення і настальгіі: Калюжыцы не раз будуць успамінацца пісьменніку, самабытна афарбоўваючы яго мастацкі свет: „Śni mi się, że jestem znów małym chłopcem w Kalużycach”[2]. Сакратар пісьменніка і публіцыстка Аляксандра Зялкоўская ў сваёй кнізе *На сцежках Ваньковіча* падкрэслівае: „Wańkowicz nieraz twierdził, że ogromnie dużo zawdzięczał swemu pochodzeniu, ziemi, na której się urodził i wychował. Była ona dla niego źródłem wspomnień, to one dały pierwsze rysy jego bogatej, kolorowej osobowości, to jej zawdzięcza swą bliskość z ziemią, przyrodą”[3].

Драматызм і перыпетыі 10–20-х гг. XX стагоддзя пазначыліся на жыццёвым і творчым лёсе М. Ваньковіча, які многае спазнаў і перажыў, трапіўшы у віхуру тагачасных падзей: удзельнічаў у Першай сусветнай вайне, ваяваў пад камандаваннем генерала Юзафа Доўбар-Мусніцкага ў Польскім Корпусе, які ў маі 1918 года быў расфарміраваны, польска-савецкай ваеннай кампаніі, а ў 30-я гады ў складзе дэлегацыі польскіх пісьменнікаў наведаў СССР. Досвед пра гэтыя часы знайшоў адлюстраванне ў наступных творах М. Ваньковіча: *Абрыўкі эпапеі* (*Strzępy epopei*, 1923), *Шпіталь у Ціхінічах* (*Szpital w Cichiniczach*, 1926), *Апер’еная рэвалюцыя* (*Opierzona rewolucja*, 1934). У 1926–1927 гг. пісьменнік здзейсніў

1 A. Maldzis, *Najpierszy hutarnik z hutarnikau* [u:] *Znakamityja minczanie XIX–XX st. Minsk i Minszczyna u litaraturnych tworach na rubiaży XIX–XX stst. Materyjały Biełaruska-polskaj nawukowaj kanferencyji,* Minsk, 27 krasawika 2010 g., Minsk 2011, s. 92–94.

2 M. Wańkowicz, *Anoda-katoda. Było to dawno,* Kraków: Wydawnictwo Literackie, 1986, s. 209.

3 A. Ziółkowska, *Na tropach Wańkowicza*, Warszawa: Wydawnictwo Polskiego Towarzystwa Wydawców Książek, 1989, s. 83.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



падарожжа ў Мексіку, адкуль дасылаў у газеты і часопісы нарысы-рэпартажы, якія пазней будуць выдадзены асобнай кнігаю *У касцёлах Мексікі* (*W kościołach Meksyku*, 1927). М. Ваньковіч – заснавальнік, а ў 1927–1939 гг. – саўладальнік Выдавецкага Таварыства „Рой”. У 1939–1958 гг. ён знаходзіўся ў эміграцыі, у 1943–1946 гг. – працаваў ваенным карэспандэнтам Польскай Арміі на Усходзе і Другога Польскага корпуса ў Італіі. З 1949 па 1958 гг. жыў у ЗША. Вырашыў вярнуцца ў ПНР, за што быў востра крытыкаваны ў польскіх эміграцыйных колах. А. Мальдзіс адзначае: „Вярнуўшыся ў Варшаву, Мельхіёр Ваньковіч стаў вельмі папулярным чалавекам. Ён друкаваў дасціпныя артыкулы ў прэсе, выступаў з гутаркамі (gawędami, прыгадаем, што гэта быў вельмі папулярны жанр і ў беларускім фальклоры, і ў творчасці Сыракомлі, яго паслядоўнікаў) па тэлебачанні”[4]. У 1964 годзе па прычыне падпісання *Ліста 34*, скіраванага супраць цэнзуры ў краі, і за абвінавачванні ў магчымай перадачы забароненай інфармацыі радыё „Свабода” Ваньковіч быў арыштаваны. Атрымаў 3 гады турэмнага зняволення, але на падставе амністыі прысуд быў заменены на 1,5 гады хатняга арышту. Успамінамі пра перажытае, ваеннае ліхалецце і рэаліі беларуска-польскага сумежжа прасякнуты кнігі М. Ваньковіча *Зелле на кратары* (*Ziele na kraterze*, Нью-Йорк, 1951, выданне ў Польшчы – 1957), *Тады і сёння* (*Tędy i owędy*, 1961), *Ад Стаўбцоў да Каіра* (*Ot Stołpców do Kair*, 1969). І, нарэшце, своеасаблівы каментар да ўласнай творчасці – кнігі *Prosto od krowy*, 1965, *Karafka La Fontaine'a* (1972–1981), у якіх прадстаўлены развaжанні аб літаратуры, рэпартажы як жанру, аб псіхалогіі пісьменніцкай працы ў іх універсальных і нацыянальных характарыстыках.

Такім чынам, жыццё і творчасць Мельхіёра Ваньковіча самым непасрэдным чынам звязаныя з рэаліямі, гісторыяй і культурай Беларусі. На наш погляд, асаблівую цікавасць у такім кантэксце ўяўляюць нарысы-рэпартажы, якія з’яўляюцца ўдзячным матэрыялам і для сённяшняга чытача, бо дазваляюць выявіць і спазнаць невядомую канкрэтыку жыцця на беларуска-польскім памежжы ў ХХ стагоддзі. Сам аўтар далучаў свае нарысы-рэпартажы да „літаратуры факту”, але іх прырода больш цікавая і патрабуе разгляду праз прызму традыцыі і наватарства[5]. Жанр ваньковічаўскіх нарысаў-рэпартажаў – пагранічны, знаходзіцца на стыку публіцыстыкі і мастацкай літаратуры, дэманструе шырокую аўтарскую эрудыцыю, глыбокія гістарычныя і народазнаўчыя пазнанні, этнаграфічную дасведчанасць, архітэктурную кампетэнтнасць аўтара і г.д. Рэпартажная спадчына М. Ваньковіча – гэта не толькі крыніца прыгранічнага нарадазнаўства 20–30-х гг. ХХ ст., тагачаснае сведчанне прыгажосці беларуска-польскіх крэсаў у розных сферах жыцця, штодзённага побыту, прыроды, але таксама і дакументы пісьменніцкага і журналісцкага досведу. На такую ідэйна-мастацкую спецыфіку нарысаў-рэпартажаў М. Ваньковіча ўказваюць і некаторыя даследчыкі: „Szkoła Wańkowiczowskiego reportażu wyrosła z rozległej tradycji twórczej,

4 A. Maldzis, *op. cit.,* s. 93.
5 A. Ziółkowska, *op. cit.,* s. 83.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



bogatej, potocznej prozy tak zwanych kresów. Hojna rozrzutność słowa łączy pisarzy jednej aury językowo-stylistycznej, jeśli tak można powiedzieć, aury tamtego regionu: Mickiewicza, Wańkowicza, Pruszyńskiego. Jest to język kolorowy, żywy, powstały na styku dwóch cywilizacji”[6].

Нарысы-рэпартажы М. Ваньковіча вызначаюцца шматаспектным падыходам пры адлюстраванні ўбачанага на крэсах, жаданнем пісьменніка як мага глыбей пазнаць і, па-магчымасці, звярнуць увагу грамадскасці на існуючыя праблемы ў гэтым рэгіёне. Змест падарожных твораў пісьменніка ўключае апісанне горада, мястэчка, вёскі ці нават сядзібы, тутэйшай прыроды, архіўныя матэрыялы з гісторыі гэтага месца, даныя аб сучасным стане развіцця ў ім вытворчасці, рамяства і гандлю ў параўнанні з мінулым, фальклоры, этнаграфічныя дэталі, г.зн.матэрыяльнае і духоўнае жыццё рэгіёну. З рэпартажаў М. Ваньковіча можна даведацца пра архітэктуру гарадоў, пра замкі і палацы, якія ён наведаў і якія ў другой палове XX стагоддзі пакінулі пра сябе памяць пераважна ў руінах ды ў валах замчышчаў. Дзякуючы публіцыстыцы М. Ваньковіча, можна добра ўявіць тапаграфію беларускіх гарадоў і мястэчак, іх адметнасць, характар заняткаў насельніцтва. Тым больш, што аўтар не аднойчы падкрэслівае сваё імкненне да аб’ектыўнасці.

Канцэптуальна-сістэмнае вывучэнне нарысаў-рэпартажаў М. Ваньковіча дае падставы вылучыць некалькі праблемна-тэматычных зон увагі пісьменніка і журналіста, якія, безумоўна, інспіраваныя тагачаснымі беларускімі рэаліямі:

**Матыў мяжы.** Як вядома, у выніку польска-савецкай вайны 1920 года спачатку ў Мінску, пазней ў Рызе адбыліся перамовы паміж прадстаўнікамі ўрадаў абодвух бакоў, якія скончыліся Рыжскай дамовай 1921 года. Да Польшчы адышлі заходнебеларускія і заходнеўкраінскія землі. Яшчэ ў кастрычніку 1920 года польскія войскі занялі Віленскі край. Мельхіёр Ваньковіч перыядычна наведваў гэты прыгранічны рэгіён, а ў 30-я гг. здзейсніў на працягу некалькіх месяцаў падарожжа ўздоўж польска-савецкай граніцы, у выніку якога з’явіўся цыкл нарысаў-рэпартажаў. Ва ўступным слове да вядомага твора Сяргея Пясецкага – рамана *Каханак Вялікай Мядзведзіцы* – Мельхіёр Ваньковіч так успамінаў сваю „крэсовую” вандроўку: „Летам 1936 г. я зрабіў восем тысячаў кіламетраў, кружляючы ўздоўж усходняй граніцы. Наша граніца з Саветамі хоць і патужэла ў абдратаванні, дрыжыць непакоем. Так, нібы мы знаходзімся ля падножжа вулкана. На ім растуць кветкі і пасвяцца козы. Толькі застылыя ў падножжа шлакавыя лавы прамаўляюць пра тое, што было. І чуем пад зямлёй няўлоўнае трымценне. На граніцы прамінуў час залатых інтарэсаў – імпартовых і экспартовых, кантрабандысцкага эльдарада, ашалелых рэйдаў, арганізаваных гуртоў. Жыццё граніцы пайшло пад зямлю, але не замерла.

Я паходжу з Віцебска-Смаленскай брамы, брамы семдзесят кіламетраў ушыркі, у якой на працягу яе гісторыі адбылося 28 вялікіх бітваў. Можа, таму мы,

[6] *Ibid.,* s. 34.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



людзі адтуль, маем адмыслова адчувальнае сейсмічнае вуха на шолахі з еўразійскіх абшараў, на мелодыю граніцы, якая ўсяляк у нашай гісторыі бегла ад бярозкі да бярозкі, ад балацінкі да балацінкі, пасам невядомым, пасам шырокім, не раз на некалькі дзесяткаў кіламетраў. Можа таму я спецыяльна старанна занатоўваў тыя трымценні граніцы"[7].

Сам пісьменнік не ведаў, што чакае яго падчас гэтага падарожжа, але ўспрымаў усе па-мудраму: „Kiedy wyjeżdżałem na kresy – wróżono mi egzotyzm i złe drogi. Jako żywo – ani tego, ani owego nie uświadczyłem w nadmiarze i śmiele rzec mogę, że w innych częściach Rzeczypospolitej drogi gorsze widziałem niż na naszych ziemiach wschodnich. Jest tam tych dróg twardych po prawdzie mówiąc cztery kilometry na stu mieszkańców, podczas gdy we Francji sto czterdzieści kilometrów, ale te, co są, jak na wymagania nie zepsutego i nie rozpieszczonego Polaka – jeszcze są jakie takie"[8].

Сапраўды, назіранні аб жыцці на мяжы – рэальнай, беларуска-польскай, з яе драматызмам, штодзённымі цяжкасцямі і нечаканасцямі – не раз з'яўляюцца ў творах М. Ваньковіча. Нездарма адно са сваіх эсэ ён назаве *Граніца – незразумелая, як смерць* – і будзе разважаць наступным чынам аб феномене памежнай тэрыторыі: „Każda granica ma w sobie coś niesamowitego i mistycznego. Bo to taka sama ziemia z drugiej strony, a tak ludziom życie inne. Zdawałoby się, że na naszym wschodzie, na którym nie ma naturalnych granic, poczucie tej niesamowitości się zmniejsza. Tymczasem jest odwrotnie. Stojąc w stroju kąpielowym nad jakimś strumykiem belgijsko-holenderskim albo jadąc łódeczką przez Bidassoa na granicy francusko-hiszpańskiej (rzecz prosta – nie teraz), albo ciągnąc z grupą zajadającą sandwicze nad granicą norwesko-szwedzką, albo leżakując na pokładzie stateczku na włosko-szwajcarskim jeziorze chciałoby się powiedzieć:

– Bzdura i nonsens. Zabawki dla dorosłych dzieci.

A tam wszędzie przecież jest woda czy choćby wąwóz. Tu – nic. A przecie ma się poczucie, że się stoi nad istotną granicą.

Pamiętam, jak w Smoleńsku przed pierwszą wojną światową pytał mnie brodaty *izwoszczyk:*

*Wam, barin, na polskuju storonu?*

Już tej Rzeczypospolitej wszelki ślad tu wytęchł. Od roku 1654 nie władaliśmy Smoleńskiem. A przecież w pamięci ludzi jedna strona Dniepru była polska, a druga rosyjska"[9].

Так, напрыклад, у нарысе-рэпартажы *Nadgraniczna bieda* М. Ваньковіч распавядае пра штодзённыя клопаты і нялёгкае жыццё жыхароў прыгранічнага Івянца, якія традыцыйна займаліся ганчарнай справай, аднак рэаліі сучаснасці змянілі іх жыццё ў бок пагаршэння (і гэта не іх віна, а бяда). Аўтар вядзе размову пра тое, наколькі гэта цяжкае рамяство і колькі мала атрымлівае за плён сваёй працы ча-

[7] S. Piasiecki, *Kachanak Wialikaj Miadzwiedzicy,* Minsk: Wyd. Wiktar Chursik, 2009.
[8] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 137.
[9] *Ibid*, s. 8–9.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



лавек: „Siedzi garncarz nad kupą mokrej gliny. Między jego dłońmi, zwierającymi się i rozwierającymi jak najprecyzyjniejsza maszyna, wiruje narastający kształt. O dłoń, o palce w ciągu dwunastu godzin rżnie lepka forma, którą wykształca własnym mięsem. Za kopę dużych gładyszy majster mu płaci dwa złote. Ale za te pieniądze należy nie tylko ulepić te sześćdziesiąt gładyszy, ale gliny nawieźć, rozrobić, a potem wypalić”[10].

М. Ваньковіч неаднойчы прызнаваўся, што яго вельмі хвалюе пытанне „памежнасці” ў розных яго праяўленнях: як ў дачыненні да гісторыі, канкрэтнай прасторы, так і ў дачыненні да памежных станаў чалавека, цэнтра і перыферыі яго экзістэнцыі. Прыкладам могуць служыць наступныя разважанні аўтара: „Myślę, że martwa granica jest jak rad: przepala nie tylko umierające miasteczka, ale i dusze nadgraniczne”[11]. Жыццё на мяжы прымушала па-іншаму глядзець на свет і быць падрыхтаваным да розных нечаканасцей і выпрабаванняў: „A tam, na tym Wschodzie, na wschodzie tej kulturalnej Europy, kiedy gasły naftowe lampki i wiatr szedł szerokim jekatierinińskim traktem między brzozami, ludzie udawali się na spoczynek, jak przed wiekami, kiedy, jak pisał Sienkiewicz, «kto wieczorem na pograniczu układa się spać, nigdy nie wie, czyli nie rozbudzi się w pętach albo z ostrzem mieczy na gardzieli»”[12].

**Першая сусветная вайна і яе наступствы.** Заканамерна, што падзеі і жахі Першай сусветнай вайны, тыя драматычныя маральныя і чалавечыя выпрабаванні знайшлі адлюстраванне і ў творах М. Ваньковіча. Напрыклад, вось якую сумную статыстыку, жахлівы рэестр наступстваў вайны на „крэсовых” беларуска-польскіх землях можам знайсці ў нарысах Ваньковіча і пісьменніку нельга не паверыць: „Ziemie, na której obrócono w perzynę milion siedemdziesiąt cztery tysięcy budynków, unicestwiono 63 procent dworców, zburzono 390 dużych i 2019 małych mostów, zdemolowano 78 warsztatów kolejowych, zdewastowano dla tła przemysł na ogólną sumę miliard osiemset milionów złotych, zwyż sto milionów korcy zboża i produktów rolnych uległo zniszczeniu na pniu w pierwszych dwu latach wojny, na czterech i pół miliona hektarów zaprzestano uprawy, zabito lub zarekwirowano więcej niż cztery miliony bydła, wysiedlono 3 000 000 ludzi, sto milionów metrów drzewa wywieziono bez odszkodowania… Zarządzony spis ludności z 1921 r. wykazał, że ludzie zamieszkują 75 000 budynków niemieszkalnych – chlewów, szop, stodół. Jeszcze jesienią 1918 r. znalazłem się na kresach. Widziałem ludność mieszkającą w ziemiankach, pola zdziczałe, gdzieś wśród chwastów rudział drut kolczasty… Na baranowickim cmentarzu widziałem obelisk dźwignięty ku czci 180 zarażonych i zmarłych w walce z epidemią lekarzy i sanitariuszek”[13].

---

[10] *Ibid.,* s. 14.
[11] *Ibid.,* s. 19.
[12] *Ibid.,* s. 11.
[13] M. Wańkowicz, *Przez cztery klimaty 1912–1972,* Warszawa: PIW, 1972.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



Нават прырода на гэтай тэрыторыі не можа „ачуняць” пасля ўжывання газаў: „Sad w Łaskim Brodzie nie owocuje, bo drzewa są zatrute gazami. Tylko młode drzewa, wyrosłe po wojnie, dają owoc”[14]. Такая сітуацыя вельмі непакоіла пісьменніка і журналіста: вайну ён лічыў злачынствам супраць чалавечнасці.

**Беларускі хранатоп.** Ужо самі назвы многіх нарысаў-рэпартажаў М.Ваньковіча народжаны пагранічнай канкрэтыкай, пазначаны беларускімі тапаграфічнымі маркерамі: *Sahib-Girej i garncarze w Iwieńcu, Nadgraniczna bieda, Ciężka egzotyka kresowa, Na tej Ziemi Stołpieckiej, Na zamku mirskim i wśród chłopstwa, Piasek na miejscu Nalibockiej Puszczy, Kiedy poczyna się Niemen, Wzdłuż Berezyny* і інш. У гэтых творах этнаінфарматыўны сэнс многіх апісанняў беларускай зямлі ўзбагачаны яскравай эмацыянальна-ацэначнай экспрэсіяй, што сведчыць пра асаблівыя адносіны аўтара да прадмету расповеду. Беларускі літаратурна-краязнаўчы дыскурс нарысаў М. Ваньковіча насычаны разнастайнымі тутэйшымі тапонімамі: аўтар даволі часта канкрэтызуе геаграфічныя каардынаты, у якіх адбываецца яго падарожжа (Баранавічы, Глыбокае, Ліда, Гродна, Ашмяны, Смілавічы, Івянец, Волма і шмат іншых гарадоў, мястэчак і вёсак). Тапонімы як бы метафарызавалі гістарычны і культурны вопыт той супольнасці, што жыла і жыве на дадзенай тэрыторыі. Вачыма пісьменніка-журналіста мы ўспрымаем навакольныя мясціны, з характэрнымі для іх жыццём, побытам, пейзажам: „Od prawej teraz przychodzą rzeki tak piękne, jak wyśnione w bajce ułożonej przez malarza i przez poetę. Już minęli Willię, teraz srebrzysta, powolna Niewiaża wpada pod Czerwonym Dworem; wysoko w białych obłokach w ciemnym listowiu parku stoi Czerwony Dwór Tyszkiewiczów”[15]. Так, у нарысах мы сустрэнем згадкі пра вядомыя з даўніх часоў знакамітыя магнацкія роды на Беларусі (Храптовічы, Тышкевічы і інш.), а таксама рэалістычныя апісанні шляхецкіх і магнацкіх сядзіб, праўда, у меншай ступені побыту, укладу, звычаяў тутэйшых сялян (яны з'яўляюцца эпізадычна, але ўяўляюць не меншую цікавасць для сённяшняга чытача).

Пейзажныя замалёўкі ў нарысах-рэпартажах М. Ваньковіча самым непасрэдным чынам звязаныя са шматлікімі рэкамі, азёрамі, адвечнымі пушчамі беларускага краю. Напрыклад, мы не раз знойдзем у тэкстах згадкі пра малыя і вялікія рэкі як своеасаблівы інтэграцыйны, жыццядайны фактар, чыннік повязі з краінай дзяцінства, а менавіта: Дзісна, Мышанка, Неман, Шчара, Лань, Беразіна (наконт апошняга ў пераліку гідроніма аўтар непасрэдна ў спасылках тлумачыць: „не тая, што звязаная з Напалеонам, а тая, што ўпадае ў Нёман”). У ваньковічаўскіх нарысах-рэпартажах часцей сустрэнем апісанні Нёмана, якому прысвечаны нават асобны артыкул краязнаўчага характару *Kiedy poczyna się Niemen*. Вось як разважае аўтар аб ролі і значэнні Нёмана ў гістарычнай перспектыве для мясцовага насельніцтва: „To miejsce nazywa się Świrynowo. Za Stołpcami. Nad samą granicą. Przez zielone łęgi sączy się struga – tu się zaczyna Niemen. Właściwie to

[14] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 140.
[15] *Ibid.*, s. 121.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



z tym poczynaniem się Niemna jest jak z poczynaniem się Polski. Mapy tak mówią – inaczej serca ludzkie i pamięć ludzka. Poczyna się Niemen w powiecie ihumeńskim. Pamiętam ten bagnisty teren między wsiami Dołhinicze, Zabolocie i Borki”[16]. Услед за традыцыяй М. Ваньковіч называе раку „бацькам і карміцелем” („ojciec i żywicel”), але зараз, падкрэслівае, многае змянілася: жыхары наднеманскіх абшараў літаральна вымушаны выжываць: „Może gdzie indziej, ale nie tu, nie pod granicą; stamtąd – granica zamknięta; tu z tej strony – lasy wycięte. Już i dawniej bez Niemna by nie wyżyli; teraz on ich nie karmi, a łąki, czterdzieści hektarów, za granicą. Koni nie ma czym utrzymać”[17].

Яшчэ адно вартае ўвагі назіранне пісьменніка-падарожніка, якое актуалізуе вядомы караткевічаўскі вобраз-сімвал „зямлі пад белымі крыламі”: наднёманскі край – сталіца буслоў, бо ледзь не на кожным дубе, як заўважае аўтар, па некалькі іх гнездаў: „Co zakręt wyłaniał polany leśne dębowe, na których niezliczone rzesze bocianie miały swoje stolice. Pewnego dnia rozbiliśmy namiot na uroczysku, gdzie na każdym dębie po kilka gniazd wisiało…”[18].

М. Ваньковіч вядзе размову ў нарысах-рэпартажах пра своеасаблівы культ лесу ў беларусаў, яго жыццядайны характар. Напрыклад, наступныя словы пісьменніка гучаць як своеасаблівы гімн-ушанаванне гэтай зямлі і яе жыхарам: „W lesie, pod lasem, w środku lasu, od wieków wiecznych, od królów i od wielkich książąt litewskich, od Kunigasów i od Kriwe Kriwejtów, przez tatarskie zagony do Dadżbogowych czasów, w oćmę lat, w niepamięć – od kiedy jak bóbr, jak borsuk, jak zwierz – żył chłop… Las jest dla chłopa tym, czym wielbłąd dla Beduina, czym renifer dla Lapończyka: żywi go na wszelkie sposoby. Toteż chłop białoruski powtarza z całym przekonaniem:

– Chto w lesie nie wor, toj nie hospodar!”[19].

Як сапраўдны журналіст, аўтар хвалюецца за будучыню Налібоцкай пушчы, піша пра тое, каб бяздумна не прадавалі лес і ашчадна адносіліся да яе жывёльнага і расліннага свету. М. Ваньковіч вобразна называе гэты працэс „сімфоніяй знішчэння”: „Sprawy leśne dla kresów to zawsze były sprawy wielkiej wagi. Kraj nimi oddychał. Nie pamiętam, żeby mi dzieciństwo upływało w kulcie roli. Była to nudna sprawa, na której zawsze wysuszyło lub wygoniło w tym roku, jak najstarsi ludzie nie pamiętają”[20].

Не абмінуў сваёй увагаю М. Ваньковіч і возера Нарач, апісанню якога прысвяціў не адзін радок (напрыклад: „… w dole srebrzyła się woda Narocza”) і прыгажосць якой услаўлялі многія тагачасныя аўтары. Тут дарэчы можна ўспомніць і нарыс Сяргея Пясецкага *Perła polskiej północy*, дзе другі вядомы

[16] *Ibid*., s. 121.
[17] *Ibid*., s. 122.
[18] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 112.
[19] *Ibid*., s. 106.
[20] *Ibid*., s. 99.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



ўраджэнец беларускай зямлі таксама цудоўна жывапісуе возера: „Teraz jedziemy malowniczą drogą, biegnącą wzdłuż brzegu jeziora. Narocz to znika nam z oczu, to nagle ukazuje całe bogactwo swych wód i przepych barw. Droga pnie się w górę, opada w dół, przemyka się przez wsie, pola i roztacza coraz to nowe widoki. Każdy piękny, każdy odrębny, każdy wabiący oko. Więc układają się we wspomnieniu jak śliczna, chaotycznie rzucona na brzegi jeziora mozaika… Gdy patrzę z urwistego brzegu na jezioro, to wygląda jak roztopiona turkusowa masa. Drugie niebo. I aby zwiększyć to podobieństwo, toną w jego nurtach zastygłe w bezruchu u góry obłoki”[21].

М. Ваньковіч не раз падкрэслівае ў сваіх рэпартажах-нарысах незвычайны эфект пазнавання беларускага краю, які заключаецца ў тым, што яго нельга „падвярстаць” пад нейкую вядомую схему, як, напрыклад, падарожнічаючы паблізу Татраў: „Teraz, gdy tylko auto minęło Białystok i wzięło kurs na wschód – na Wołkowysk – kiedy zaczęły się lasonki brzozowe i bure chałupy jeszcze tu i owdzie nie skomasowanych wsi, a wieczorkiem w jakiejś kotlince wjechaliśmy w jeziorko mgły – od tego wieczoru z dnia na dzień coraz bardziej rosło w mojej córce poczucie, że nie przyjeżdża, a wraca, że to właśnie te drogi, te wsie, te dwory, te obyczaje zna najlepiej”[22].

Як прадстаўнік вядомага роду на Беларусі, М. Ваньковіч так разважае аб стаўленні некаторых магнатаў-землеўладальнікаў і шляхты да традыцый і мовы гэтай зямлі: „Co jest charakterystyczne dla ziemiaństwa kresowego, to to, że lubią język białoruski i chętnie nim rozmawiają. Ot i teraz sypią się anegdoty i opowiadania białoruskie. Pan Mecherzyński – talent nieprzeciętny – przebiera się za babę białoruską i solo odtańcowuje lawonichę. Potem zaczynają chórem śpiewać Oj tam na gorie, oj tam na krutoj. Ta piosenka wydaje mi się z naleciałościami rosyjskimi. Ale za to melodia jest czysto białoruska. Koniec frazy łamie się, spada z tonacji i ciągnie się aż wyczerpania tchu. To takie zawodzenie zalatuje ze wszystkich stron z pól bialoruskich”[23]. Каб перадаць мясцовы каларыт, самабытнасць убачанага і пачутага, аўтар не аднойчы аздабляе свой расповед беларускімі слоўцам ці выразам (напрыклад, прыпеўка „Адзін лапаць, адзін бот, дык на тое трудны год” і г.д.).

Зыходзячы з перспектывы і сітуацыі дня сённяшняга, уяўляюць цікавасць і разважанні М. Ваньковіча аб нацыянальнай тоеснасці насельніцтва памежных тэрыторый: „Przez wiele powiatów, światami dalekimi przepływali świrynowianie, rok w rok ludy różne wszelkimi językami gadały do nich z Niemnowych brzegów, stawały im po wsiach, po miastach różnorako budowanych rozliczne obyczaje. Czy to wszystko nie doprowadziło ich do jakieś syntezy, do uświadomienia sobie swej narodowości? Jeśli idzie o jakąś odległą Polskę, o jakiegoś tam Kościuszkę czy innego – to nie. Oni byli tutejsi. Ale jeśli idzie o obyczaj wkorzeniony w duszę, o strukturę

[21] S. Piasecki, *Autodenuncjacja. Teksty autobiograficzne, wywiady, wspomnienia, publicystyka,* Łomianki: LTW, 2013, s. 39.
[22] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 7.
[23] *Ibid.,* s. 121.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



duchową – to tak. Mieli na spalonych słońcem piersiach czarne zatłuczone szkaplerze, mieli swego świętego Fabiana, mieli obyczaj życia, unormowany z dziada pradziada, jak kwitnienie zbóż, wzrost trawy polnej. Historyjki o Polsce były im obojętne, ale nie był dla nich obojętny dźwięk prawidłowej mowy polskiej, mowy, która miała dla nich uroczystość nabożeństwa, dostojność ambony, powagę wieków".[24] На самай справе, нацыянальнае пытанне было на памежных тэрыторыях заўсёды актуальным і дастаткова складаным, беручы пад увагу тагачасную палітыку польскай дзяржавы. Як слушна заўважае ў сваім даследаванні Хэлена Глагоўская, „ludność białoruska, która znalazła się w granicach II Rzeczypospolitej była zróżnicowana głównie pod względem wyznaniowym. Kryterium przynależności religijnej określało też często opcje narodowościowe społeczeństwa. Ludność katolicka optowała głównie za polskością, chociaż mówiła tym samym językiem «prostym», co i ludność prawosławna. Wykorzystywała to polityka państwa i Kościoła katolickiego. Za Białorusinów często uznawano wyznawców prawosławia, którzy sami najczęściej określali się mianem «tutejszych»"[25].

М. Ванькович не пакідае па-за ўвагай і функцыянаванне тагачаснай сістэмы правасуддзя (бо, як мы ведаем, на памежных тэрыторыях дзейнічалі законы ваеннага часу) і распавядае, напрыклад, аб непаразуменнях, якія перыядычна ўзнікалі пры разглядзе судовых справаў, калі суддзі з Галіцыі і кароннай Польшчы не разумелі крэсовай, г.зн. „беларускай пальшчызны", па прычыне чаго ўзнікалі розныя недарэчныя сітуацыі: „Język polski, język liturgiczny, królujący nawet na nagrobkach prawosławnych cmentarzy, język pański, w znaczeniu dziejowym najlepszy, to znaczy język kultury i ogłady – teraz wlewał się na kresy stymlem papierków i cyrkulyrzy jako język urzędniczy. Tropiłem tę sprawę po sądach, gdzie zrezygnowane i skwaszone galicyjskie doktory praw sądziły białoruskich chłopów"[26]. Напрыклад, у адным са сваіх нарысаў М. Ванькович распавядае пра тое, як стаў сведкам пасяджэння мясцовага суда ў мястэчку Заастравечча тагачаснага Нясвіжскага павета: „W akcie oskarżenia, skoncypowanym po polsku przez miejscowego kauzyperde, pokrzywdzony Iwan żalił się, że oskażony Aukim straktował go przez «ty psie». – Iwan, sobakaż ty sobaka – wybucha Aukim – kaliż ja na ciabie pies kazau?" І далей аўтар іранічна заключае: „Gdzie indziej sędzia-Galicjanin, przegląnąwszy akta i stwierdziwszy, że skradzione rzeczy były przechowane w *saraje* (stodole), wydał zarządzenie, aby owego Saraja doprowadzić do sądu. Inny chciał obłożyć grzywną zeznającego, który twierdził, że przyjechało *szmat* policji (szmat znaczy dużo po białorusku), jako że policji nie można wymyślać od szmat"[27]. На падобную сітуацыю звяртае сваю ўвагу і Х. Глагоўская: „Ludność miejscowa urzędników i nauczycieli przysłanych z Polski

[24] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 108.
[25] H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku. Od Imperium Rosyjskiego do Unii Europiejskiej,* Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2012, s. 184.
[26] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 50.
[27] *Ibid.,* s. 106.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



etnograficznej nazywała «galileuszami», co było synonimem chytrości, przebiegłości, karierowiczostwa, dumy i złego obchodzenia się z ludnością. Stosunek do elementu napływowego był naczęściej negatywny – był on nielubiany i traktowany jak zaborca”[28].

Мельхіёр Ваньковіч часта вядзе размову пра кручкатворства чыноўнікаў, „адміністрацыйную абракадабру” (выраз пісьменніка) ў дачыненні да насельніцтва пагранічных тэрыторый. Напрыклад, каб больш вобразна і пераканаўча паказаць „віртуознасць” такой бюрактратычнай сістэмы, аўтар уключае ў тэкст аднаго з нарысаў наступны сатырычны дыялог, прычым па-беларуску (на лацінцы) з паралельным перакладам на польскую мову:

– Мы з табой ішлі?
– Ішлі…
–Кажух знайшлі?
– Найшлі яго.
–Я яго табе даў?
– Даў.
– Ты яго ўзяў?
– Узяў.
– Гдзе ж ён?
– Хто?
– Кажух…
– Які кажух?
– Мы з табой ішлі?
І г.д.”[29].

**Літаратура і пісьменнікі.** Свае нарысы-рэпартажы М. Ваньковіч аздабляе эпіграфамі і цытатамі, зваротамі, актуалізаванымі той ці іншай тэмаю, з Адама Міцкевіча, Эльжбеты Дружбацкай, Уладзіслава Сыракомлі, Марыі Канапніцкай, Тодара Буйніцкага і многіх іншых пісьменнікаў. Гэта, безумоўна, надае адметны кантэкст творам, робіць больш насычаным іх літаратурна-мастацкі модус. Цікавы і той факт, што ў рэпартажах сустрэнем таксама прозвішчы тагачасных беларускамоўных аўтараў Заходняй Беларусі, якіх М. Ваньковіч ведаў ці з якімі быў добра знаёмы. Так, нарыс *На Стаўбцоўскай зямлі* пачынаецца эпіграфам-словамі Казіміра Сваяка:

Бор, гдзе сіні здаль віднее,
Гдзе ўзгоркі, яры, нівы,
Гдзе мой брат з бяды марнее
Хоць цвярозы, не лянівы.

[28] H. Głogowska, *op. cit.,* s. 177.
[29] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 203.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



М. Ванькові́ч быў знаёмы з Міхасём Машарам, ведаў яго жыццё і штодзённыя клопаты, тое, што за справу, звязаную з беларушчынай, пісьменнік быў зняволены пэўны час у Лукішках. Таму вельмі актуальным падаецца ў тагачасным кантэксце вызначэнне М. Ваньковічам самабытнага характару творчай індывідуальнасці М. Машары, а таксама пераклад на польскую мову аднаго з вершаў беларускага паэта: „Michaś Maszara, dwugektarowy gospodarz z powiatu dziśnieńskiego, to nie jest poeta ludowy regionalny, chłopska osobliwość, jak nasz Kuraś albo mazurski Kajka. Wydał szereg dużych poematów – wymieniamy się książkami: ja mu posyłam swoje, w które wydawcy wkładają cały kunszt – on w zamian mi śle ubogie tomiki, nie dające zysku, wydrapane pazurami.

Zastałem Michasia Maszarę w tym roku w polu, tak jakby o sobie napisał ten wiersz:

W białej koszuli lnianej
Wyszedłem z siewnią na rolę
I sieję owies złoty
Na rozpachnione pole.
Bułany koń w żlad skibą czyrną
Brnie, jak mój wierny cień,
Szeroką ręką miotam ziarno
Idąc w słoneczny dzień.
Słońce przenika włosy,
Twarz, piersi, nogi, ręce.
Stopy – w świerżości mam rosy,
Duszę – spieczoną w udręce.

(Wiersz jest w istocie wiele lepszy. Nie mam kogo prosić o przetłumaczenie z białoruskiego)”[30].

Адметнае месца ў сваіх нарысах-рэпартажах М. Ваньковіч адводзіць Адаму Міцкевічу і вядзе размову пра яго ролю і значэнне ў сваім жыцці і творчасці: „Wychowałem się pod Mickiewiczem. To znaczy – pod wielkim duplikatem oryginału Mickiewicz na Ajudahu skale, malowanym przez pradziada Walentego. W dziecinnej wyobraźni co słowo to szereg obrazów. Czytałem jakąś straszliwie przejmującą książkę o krwawym Abd El-kaderze, rządzącym ongiś Krymem, tam właśnie, gdzie ten Mickiewicz tak śmiało siedzi, zawinięty w burkę. Dręczył mnie problem, czy taka burka naprawdę jest nieprzemakalna i czy w pieczarach na Ajudahu są zbóje. Mickiewicz wydawał mi się właśnie półbogiem (… będę z Panem moim gadał…). Podobno tak cierpiał, aż bluźnił. Ale niewiadomo, jak na te sprawy Bóg spojrzy, bo cierpiał za naród i bluźnił z miłości”[31]. М. Ваньковіч, выкарыстаўшы магчы-

[30] M. Wańkowicz, *Przez…,* s. 180.
[31] M. Wańkowicz, *Anoda-katoda…,* s. 430.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



масць падарожніка, вядзе і чытача сцежкамі Міцкевіча (раздзел *Калдычаў*): „Ziemia Mickowiczowska – żywcem jak ta w *Panu Tadeuszu* – biegła w dal polami, malowanymi zbożem rozmaitym"[32]. Нездарма М. Ваньковіч часта згадвае *Пана Тадэвуша*, які стаў для Адама Міцкевіча, як вядома, спробай захаваць у памяці, паэтычным уяўленні той лад жыцця, традыцыі, якія знікалі пад націскам сучаснасці. Мусіць, падобны стан адчуваў і М. Ванковіч, часта даючы каларытнае апісанне мясцовых сядзіб, паэтызуючы традыцыйны лад гаспадарчых і сямейных спраў і клопатаў, духоўны свет гэтай зямлі, адкрываючы непаўторнае і прыгожае ў паўсядзённым атачэнні прыроды і побыту блізкага прынёманскага краю: „Kto nie zna dworu kresowego ani dworku, ten nigdy nie zrozumie tej mitologii, w jakiej nimbie tkwiły powieszone na ścianie portrety Kościuszki, księcia Józefa skaczącego do Elstery i Mickiewicza. Święci Pańscy z narodowego pamiątek ołtarza, a zarazem krewni. Coś między bóstwem a człowiekiem"[33].

Цікавасць у сучаснага чытача – аматара жыцця і творчасці Адама Міцкевіча – можа выклікаць і нарыс рэпартажнага характару, у якім М. Ваньковіч распавядае аб Варшаўскай выставе, прысвечанай Адаму Міцкевічу: „W Sali Pana Tadeusza stoją autentyczne z czasów Jankiela drewniane białoruskie cymbały. Ktoś je trącił i brzękły. Tak grały ongiś, ujrzawszy Kniaziewicza i Polskę żywą tworzącą"[34]. Узгадвае тут мімаходзь Ваньковіч і не менш легендарную асобу – ураджэнца беларускай зямлі – Леанарда Падгорскага-Аколава, які быў вядомым міцкевічазнаўцам, а пасля Другой сусветнай вайны – дырэктарам Варшаўскага музея вялікага паэта („… który za Mickiewiczem wytropił wszystkie nowogródzkie ścieżki"[35]).

Выклікае прыхільнасць і ўключэнне ў тэкст аднаго з рэпартажаў М.Ваньковічаназіранняў аб феномене паэзіі Уладзіслава Сыракомлі, а ў пацвярджэнне спасылаецца на словы вядомага літаратуразнаўцы і славіста Мар'яна Здзяхоўскага: „To dla tego zapewne o poezji Syrokomli pisał Marian Zdziechowski: «Poezja Syrokomli stanowi granicę między Litwą i Koroną. Gdzie jej rzewność nie wywołuje oddźwięku, jest to znakiem, że stanęliśmy w innym kraju, w innym klimacie duchowym, wśród ludzi inaczej czujących, w inny sposób do ojczyzny przywiązanych»"[36].

У літаратуры Польшчы ХХ стагоддзя ўжо стала легендай гісторыя вызвалення з турмы Сяргея Пясецкага, вядомага перамытніка, вывядача, аўтара раманаў-бэстсэлераў 30-х гг. *Каханак Вялікай Мядзведзіцы*, *Пяты этап*, *Багам ночы роўныя*, і роля ў ёй М. Ваньковіча, які так апісвае сваё наведванне Пясецкага ў турме святога Крыжа: „Mówi tylko o pisaniu. Nie skarży się. Pyta, pyta jednym ciągiem, jak należy pisać. Komunikuję mu, że na ręce naczelnika więzienia składam

[32] *Ibid.,* s. 179.
[33] *Ibid.,* s. 431.
[34] *Ibid.,* s. 432.
[35] *Ibid.,* s. 432.
[36] *Ibid.,* s. 208.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



zaliczkę na honorarium. To go wiele nie obchodzi. Pyta, gorączkowo pyta, jak to się piszę. Mówi, co pisze. Że rozpoczął trylogię z życia przestępczego.

Kupiłem dla niego wieczne pióro i flaszkę atramentu oraz librę papieru. Ale papieru nie przyjmuje: przepisy nie pozwolają na papier luzem, musi być zbroszurowany. Obiecuję przysłać bruliony. Napełniam pióro. Patrzy z zachwytem, jak wypełnia się przezroczysty rezerwuar. Bierze z nabożeństwem do ręki i próbuje pisać. Za oknami, ujętymi w grube kraty, wielkimi miękkimi kłakami wolno opada śnieg”[37].

Не могуць не кранаць словы з ліста С. Пясецкага, адрасаванага пазней М. Ваньковічу, якія апошні цытуе ў адным са сваіх нарысаў: „Bardzo był chciał, aby Pan w przyszłości był ze mnie dumny – pisze Piasecki – i postaram się to osiągnąć. Dziękuję, bardzo dziękuję za wieczne pióro. Cieszę się nim jak dziecko. Doprawdy… Wieczorem myślę, że jak wstanę, to będę nim pisał… i bardzo podejrzliwie patrzę na każdego, kto na nie spogląda. Więcej mnie cieszy niźli kiedyś broń… Olbrzymie ułatwienie w pracy. Nareszcie mogę korzystać z tego, co stanowi cząstkę kultury. Nie mając czym Panu odwdzięczyć, przesyłam pozdrowienie od Wielkiej Niedźwiedzicy. Widuję ją w pogodne wieczory z mej celi… Jak śliczne, jak śliczne, jak cudne, jak promienne ma oczy!…”[38].

Падарожныя нарысы-рэпартажы М. Ваньковіча, маючы дакументальную аснову, прывабліваюць і сваім мастацкім дыскурсам. Гэтыя творы знаходзяцца на паграніччы літаратуры факта і белетрыстыкі. Матыў падарожжа ў ім адыходзіць на другі план, а на першы вылучаецца асоба аўтара, расповядам якога чытач давярае. Гэта ад аўтара залежыць, што менавіта годнае апісання, гэта яму належаць каментарыі і рознага тыпу рэфлексіі, у якіх праяўляюцца асобасныя адносіны да тэмы, да стварэння вобразаў. Калі ж асэнсоўваць літаратурна-мастацкую дамінанту нарысаў-рэпартажаў М. Ваньковіча, нельга не заўважыць, што вызначальнымі з’яўляюцца рэалістычнасць у паказе ўбачанага на крэсах, фактаграфічнасць жыццёвага матэрыялу, сінтэз падзейнасці і апісальнасці, імкненне перадаць дыханне складанага часу. Нездарма разважаючы на гэтую тэму, польскі знаўца асобы і творчасці М. Ваньковіча А. Зюлкоўская адзначае: „Wszyscy krytycy podkreślają świetne tradycje prozy Wańkowicza wywodzącej swój ród od takich poprzedników jak Pasek, Kitowicz, Morawski, Rzewuski, Sienkiewicz”[39]. Але, на нашу думку, творчая манера М. Ваньковіча ў большай ступені звязана з традыцыяй Юліяна Ігнацыя Крашэўскага, асабліва калі прыгадаць ягоныя цыклы нарысаў *Wspomnienia Wołynia, Polesia i Litwy* (1840), *Obrazy z życia i podróży* (1842), *Druskienniki*, (1848), *Ubiory włościan i mieszczan z okolic Brześcia, Kobrynia, Prużany* (1860). Нават павярхоўнае знаёмства з публіцыстычнай спадчынай Ю. І. Крашэўскага і М. Ваньковіча дае магчымасць убачыць тыпалагічныя сыходжанні: пісьменнікі карысталіся пры адлюстраванні праўды жыцця падобнымі прыёмамі рэалістычнага пісьма,

37 M. Wańkowicz, *Przez…,* s. 120.
38 *Ibid.,* s. 121.
39 A. Ziółkowska, *op. cit.,* s. 81.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



мастацка-выяўленчымі сродкамі, а іх творы ўяўляюць сінтэз розных нарацыйных, жанравых і кампазіцыйных спосабаў аповеду. М. Ванькові́ч, напрыклад, як бы працягвае традыцыю Ю. І. Крашэўскага адметна называць, экстрапаліруючы ў еўрапейскі кантэкст, гарады і мястэчкі Беларусі: Смаргонь – „kresowy Verdun", Глыбокае – „białoruski Brugge", Заастравечча – „kresowa Gdynia".

Не можам абысці яшчэ і таго моманту, які звязаны з паэтыкай ванькові́чаўскіх нарысаў-рэпартажаў і які выяўляе этнакультурныя асаблівасці функцыянавання мастацкага слова ў тым ці іншым рэгіёне, у сілавым полі вядомай мастацкай традыцыі. Многія даследчыкі небеспадстаўна называюць М. Ванькові́ча ў шэрагу тых, хто працягнуў традыцыі польскай шляхецкай гавэнды. І для гэтага ёсць пэўныя падставы, але ёсць і адрознасць, народжаная менавіта гісторыка-літаратурнымі тэндэнцыямі ХХ стагоддзя. Спалучэнне фактаў і суб'ектыўных уражанняў, дакументальнай асновы і анекдота, эпічных фрагментаў і лірычных партый, зададзенасці і аб'ектыўнасці, рэалістычная дэталізацыя – вось той арсенал вобразна-выяўленчых сродкаў, якія адметна фарміруюць мастацкі свет і наратыўную стратэгію твораў М. Ванькові́ча.

Такім чынам, неардынарны жыццёвы і творчы шлях Мельхіёра Ванькові́ча, а таксама яго творчасць, заснаваная на канкрэтна-гістарычных беларускіх рэаліях, аўтабіяграфічным матэрыяле, уяўляюць нязменную цікавасць, а знаёмства з нарысамі-рэпартажамі польскага пісьменніка ўзбагачае сённяшняга чытача краязнаўчымі пазнаннямі, эксклюзіўнай інфармацыяй, звязанай з гісторыяй, традыцыямі, культурай Беларусі ХХ стагоддзя, а таксама пацвярджае тэзіс пра разнастайнасць і самабытнасць краявідаў роднай зямлі, выхоўвае пачуццё гонару за бацькаўшчыну.

## Бібліяграфія

***„Baćka" polskaha repartażu z-pad Miensku***, http://www.thenews.pl1/1/91/Artykul/82088,%E2%80%9C%D%91%.D0%91%, data dostępu: 06.02.2013.

**Głogowska Helena**, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku. Od Imperium Rosyjskiego do Unii Europiejskiej*, Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2012.

**Maldzis Adam**, *Najpierszy hutarnik z hutarnikau*, [u:] *Znakamityja minczanie XIX-XX st. Minsk i Minszczyna u litaraturnych tworach na rubiaży XIX–XX stst.* Materyjały Biełaruska-polskaj nawukowaj kanferencyi, Minsk 27 krasawika 2010 h., Minsk: Wyd. W. Chursik, 2011, s. 92–94

**Piasecki Sergiusz**, *Autodenuncjacja. Teksty autobiograficzne, wywiady, wspomnienia, publicystyka*, Łomianki: LTW, 2013.

**Piasiecki Siarhej**, *Kachanak Wialikaj Miadzwiedzicy*, Minsk: Wyd. W. Chursik, 2009.

**Wańkowicz Melchior**, *Anoda-katoda. Było to dawno*, Kraków: Wydawnictwo Literackie, 1986.

**Wańkowicz Melchior**, *Przez cztery klimaty 1912–1972*, Warszawa: PIW, 1972.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 21/12/2024 19:29:07



***Wańkowiczy***, red. Natalia Hołubiewa, Minsk: Biełaruskaja Encykłapiedyja, 2012.

**Ziółkowska Aleksandra**, *Na tropach Wańkowicza*, Warszawa: Wyd. Polskiego Towarzystwa Wydawców Książek, 1989.

### Streszczenie

Artykuł został poświęcony realiom białoruskim w szkicach z podróży polskiego pisarza i dziennikarza Melchiora Wańkowicza. Autor opisuje i charakteryzuje elementy białoruskie w dorobku artystycznym i publicystycznym M. Wańkowicza (chronotyp, granica polsko-radziecka, tradycje, pejzaż, literatura i in.).

**Słowa kluczowe:** realia białoruskie, szkic, reportaż, pogranicze, chronotyp, historia, dokument, kultura, dyskurs

### Рэзюме

Артыкул прысвечаны даследаванню прысутнасці і функцыянаванню беларускіх рэалій у нарысах-рэпартажах польскага пісьменніка і журналіста М.Ваньковіча. Праз кантэкст культурнага пагранічча выяўлены і ахарактарызаваны праявы беларускасці ў мастацкай і публіцыстычнай спадчыне М. Ваньковіча (хранатоп, польска-савецкая мяжа, традыцыі, пейзаж, літаратура і інш.

**Ключавыя словы:** беларускія рэаліі, нарыс, рэпартаж, пагранічча, хранатоп, гісторыя, дакумент, культура, дыскурс

### Summary

The article represents an attempt to study the presence and functioning of Belarusian realities in sketch-reportages of the polish writer and journalist M. Wańkowicz. Belarusian component in the artistic and publicistic heritage of M. Wańkowicz is revealed and characterized through the context of the cultural borderland (chronotop, Polish-Soviet border, traditions, landscape, literature, etc.).

**Key words:** Belarusian realities, sketch, reportage, borderland, chronotop, history, document, culture, discourse